— Вышел я на этого доктора совершенно случайно, — *рассказал Евгений Александрович.* — У меня нашли заболевание крови, и я не знал, что делать. Лечили меня стандартно, но большого прогресса не было. Доктор из Лондона, у которого я постоянно наблюдаюсь, посоветовал мне поехать во Вьетнам. Там работал врач, который помог его жене — у нее был рак четвертой степени. Это не поддается объяснениям, но он ее вылечил. И я поехал в Ханой. Пробыл там месяц.

Доктор Ба с отличием окончил Петербургскую медицинскую академию, практиковался в Англии, Америке. Во Вьетнаме он создал клинику, где лечат неизлечимые болезни. География больных очень широкая: едут к нему и из Америки, и из Европы.

— Вам он помог?

— Мне стало значительно лучше. Но я еще лечусь. И сейчас лежу в больнице. Бизнес так просто не дается, все сказывается на здоровье...

— Сейчас вьетнамский доктор работает в Беларуси?

— Да, он приехал сюда, некоторое время побыл и решил остаться. Я помог ему обустроиться, мы выделили помещение для работы, сейчас оформляем лицензию...

Ему 48 лет, он приехал сюда с женой и детьми — одному 4 года, другому — 6.

— А где они живут?

— Я дал им дом (у нас был служебный коттедж), они там живут.

— Если я правильно поняла, это доктор с мировым именем?

— Это уникальный специалист, равных ему нет! Он лечит не только лекарствами, но и травами. Сочетает традиционную медицину с нетрадиционной. Травы покупает в Японии, Китае, Индии. У нас тоже много полезных трав, которые не умеют правильно применять. Он хочет наладить оптовые поставки белорусских трав во Вьетнам.



— Уже столько слухов ходит об этом докторе!..

— Да, информация быстро разносится... Я даже сам не ожидал...

Но, я вам скажу, результаты у него есть. У нас же медицина однобокая. Если сердце болит, значит, только его лечат, а надо подходить глубже. Вообще, об этом долго можно разговаривать...

— Евгений Александрович, вас в больнице сейчас наверняка лечат, как и всех. Врачи не против, что вы используете еще и другие методы лечения?

— На мой взгляд, одно другому не помеха. И, конечно, человек сам вправе решать, какую медицину выбрать — традиционную или нетрадиционную. Если их совместить, получается очень эффективно. Да и врачи мне здесь говорят, что нужно все методы использовать...

— А они, кстати, заметили у вас какие-то улучшения?

— Мне нужно было принимать антикоагулянты, но варфарин мне не пошел — была высокая склонность к кровотечениям. И вот с января я пью травы, которые мне прописал доктор Ба, и все шокированы результатом: и лондонские врачи, и белорусские врачи. Поэтому я выбрал пока такой вариант лечения...

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Доктор БА:

«Медицина — не только наука. Это еще искусство и в какой-то степени даже религия»

Известный вьетнамский доктор Ва Х. Hoang рассказал "Народной Воле" о своих взглядах на медицину.

Судьбоносное знакомство

Доктор Ба охотно согласился на встречу. Он бегло говорит по-русски, а для жены и детей уже нанял репетитора.

— Я много лечил русских, — *рассказывает доктор о себе*. — У меня клиника при государственной больнице во Вьетнаме, которая принимает разные методики лечения. Я лечу самые трудные заболевания. В основном это рак, аутоиммунные заболевания, метаболические расстройства.

Я учился в Санкт-Петербургском педиатрическом медицинском институте (теперь это академия), прошел там клиническую ординатуру, там же написал кандидатскую диссертацию. У меня было одно изобретение и два рацпредложения в России. Мне даже Sweden Pharmacia Allergy Foundation вручила престижную премию за иммунологические исследования. После меня пригласили в Англию — проводить дальнейшие исследования. Я провел в Лондоне 6 месяцев, затем уехал в Америку. Там работал как иммунолог и аллерголог. Параллельно создал свою клинику для лечения трудных болезней.

Евгений Александрович Шигалов познакомился со мной, когда я работал в Ханое. Его направил ко мне лондонский доктор, жена которого лечила у меня рак груди четвертой стадии. Она прошла все: операции, химию, но болезнь все равно возвращалась. У нее были незаживающие раны, метастазы в легких, костях, печени... Уже прошло пять лет, она жива...

Когда Евгений Александрович приехал во Вьетнам, и я услышал русскую речь, сразу вспомнил о России — это моя вторая родина. Я не знал, кто этот пациент, чем он занимается. Просто услышал, что он говорит по-русски. Мы начали общаться и подружились. Он пригласил меня в Минск. Сказал, что у него есть 10 коров, а мне очень хотелось показать детям этих животных. Я думал, что он занимается сельским хозяйством. И когда мы в первый раз на пять дней приехали в Минск, у меня вдруг возникло впечатление, что это место может стать нашим домом, что здесь можно работать...

Официальные связи

Доктор Ба много рассуждает о том, как помогать больным так, чтобы не получилось, как в известной поговорке: когда одно лечишь, а другое — калечишь.

— Вот, например, как лечат самые легкие болезни — экзему, гайморит, ангину? — *говорит он.* — Если просто лечить, не думая о последствиях, то это легко: антибиотик выпьешь — горло пройдет, симптомы исчезнут. Но прибавит ли это пациенту здоровья? И чего больше приносят антибиотики — вреда или пользы?..

Клятву Гиппократа знают все: "Не навреди!". Я вот даже не знаю, больше пользы или вреда мы приносим больным, выписывая им сильнодействующие препараты... Все очень неоднозначно...

На мой взгляд, задача врача — не просто лечить, а лечить так, чтобы человек жил долго и чтобы качество его жизни даже при самых сложных заболеваниях улучшалось...

Когда Евгений Александрович приехал во Вьетнам, он познакомил меня с белорусским посольством в нашей стране. И мы стали большими друзьями. Я не раз встречался с Чрезвычайным и Полномочным Послом Беларуси во Вьетнаме **Валерием Садохо**. Расспрашивал его о белорусской медицине, положении страны. Белорусским дипломатам была интересна моя методика. Я написал официальное письмо на имя министра здравоохранения Беларуси с просьбой о сотрудничестве и буквально через неделю получил очень хороший ответ от министра **Василия Жарко**. Он сообщил, что Минздрав хотел бы исследовать мою методику, они видят в ней перспективу.

Когда я приехал в Минск, встретился с министром Жарко и его заместителем доктором Пиневичем. Честно говоря, это первый раз, когда чиновники такого высокого уровня проявили такую заинтересованность! В других странах подобного не было — чиновники, как правило, не хотят ничего знать. Беларусь в этом смысле приятное исключение...

Победить боль

По словам доктора Ба, с его методикой ознакомились также ведущие белорусские онкологи. В ближайшее время должны начаться пилотные исследования.

— Возможно, белорусские и вьетнамские врачи смогут сделать весомый вклад в лечение раковых больных, — *говорит доктор Ба*. — Моя методика направлена на то, чтобы качество жизни людей с раковыми заболеваниями улучшилось, чтобы симптоматика стала менее тяжелой. Для многих врачей сегодня главное, чтобы были заметны изменения на снимке, чтобы опухоль уменьшилась в размере, а как при этом себя чувствует пациент, им зачастую не так уж и важно. Но если снимок улучшился, это не значит, что человек будет долго жить. Бывает, что рак уходит на две-три недели. А потом возвращается с бешеной скоростью...

Или бывает, что опухоль стала меньше, но при этом человек есть не может, встать не может, энергии никакой, депрессия... На мой взгляд, важно, чтобы после каждого лечения пациент чувствовал себя лучше.

Боли при раковых болезнях — большая проблема. Некоторым уже не показана специфическая терапия, и очень важно улучшить качество их жизни...

Травяной коктейль

Даже самые выдающиеся ученые сегодня говорят, что при лечении сложных аутоиммунных болезней надо убивать им-



мунную систему. Доктор Ба с этим не совсем согласен. По его мнению, иммунную систему как раз нужно не разрушать, а защищать и улучшать. И нужно обязательно заниматься соответствующими исследованиями в этом направлении. За ними будущее, уверен вьетнамский врач.

Доктор Ба считает, что даже если пациент выпьет литр настоя лопуха, закусит толокнянкой и на десерт употребит шалфей, то вреда организму от этого будет гораздо меньше, чем от упаковки современных сильнодействующих препаратов.

— Я сочетаю вьетнамские и российские травы, — *делится своими секретами доктор.* — Сейчас хочу использовать белорусские. Мне кажется, наши травы будут лечить ваших больных, потому что здесь прохладный и сырой климат, а белорусские травы будут воздействовать на наших больных. Я уже больше 10 лет использую травяные миксты и всегда получаю хороший результат.

Правила жизни

*Пациенты находят доктора Ба и в Минске. Получив лицензию, доктор намерен тесно сотрудничать с известным онкологом-маммологом **Леонидом Путырским.***

— Я намерен помогать Путырскому в лечении онкологических больных, — *говорит доктор Ба*. — Причем буду заниматься самыми сложными случаями. Буду советовать, какой образ жизни они должны вести, что есть.

Есть ли какие-то универсальные правила жизни для раковых больных? Есть. Для каждого вида рака они свои. И в двух абзацах обо всем не расскажешь. Каждый вид рака предполагает соответствующее питание и образ жизни: сколько надо спать, какие витамины принимать. Есть общие правила: меньше употреблять очень соленой пищи и пищи, которая содержит много раздражителей (я сейчас говорю не о специях, а о химикатах). Например, две аминокислоты аспартам и глютамат. Если исключить хотя бы их, это уже будет профилактика рака.

Нужно уменьшать дозу соли в пище, меньше есть различных колбас. Я понимаю, что многим непросто от этого отказаться, но если речь идет о здоровье, то надо.

Сейчас советуют принимать очень много кальция. Я не сторонник этого. Избыток кальция ведет к раку простаты, раку молочной железы, ряду сердечных заболеваний. На мой взгляд, лучше принимать больше магния и витамина Д. Хорошо влияет на кости витамин К2, но многие доктора, к сожалению, об этом не знают. Этот витамин есть в свежих зеленых овощах и вырабатывается в кишечнике с помощью нормальной кишечной микрофлоры.

Ваше здоровье во многом зависит от вас: как вы питаетесь, занимаетесь ли спортом...

Доктору всю жизнь нужно учиться. Для меня нет разницы, у кого черпать знания. Я человек с открытым мозгом и всегда наблюдаю за пациентами. Для меня важны не только медицинские справочники и мнения профессоров, но и опыт простых людей. Например, про натирания для суставов, которые делают из сабельника, я узнал от одного русского. И стал использовать это средство у себя на родине.

У меня был профессор Альберт Вазгенович Папаян — он был выдающимся детским нефрологом. Я был аспирантом и видел, что многим больным детям родственники приносили какие-то отвары из трав: толокнянку, подорожник, лопух. И однажды на какой-то клинической конференции выступила доцент, которая принимала только современные лекарства. И сказала, что надо запретить варить эти травы и давать их детям. И тогда профессор Папаян сказал: "Не родителей надо винить, а врачей. Потому что если бы мы хорошо лечили их детей, они не варили бы эти травы..." В этом и есть правда. И докторам, которые не очень эффективно или даже совсем неэффективно лечат больных с какими-либо заболеваниями, нужно всегда допускать возможность, что есть другой подход к лечению болезни, который нам неизвестен или которого пока нет в нашей науке. Нужно потратить время, чтобы найти эти подходы, а не опускать руки и вообще ничего не делать...

Победителей не судят

В интернете есть история о том, доктор Ба спас 12-летнюю девочку, страдающую тяжелой формой астмы. Пациентка была гормонозависимой, у нее часто случались приступы с потерей сознания. Казалось, врачи бессильны ей помочь...

— Я попробовал лечить астму не как воспаление, а как судороги, — *рассказывает доктор Ба*. — Это было мое открытие. Рассуждал примерно так: от воспаления — кашля или бронхита — человек не погибает, он погибает именно от спазма. Значит, его нужно снять. Мы ввели этой девочке через зонд противосудорожный препарат. Через 3 часа она пришла в сознание. В дальнейшем она принимала противосудорожные, и ее состояние резко улучшилось, она уже не была гормонозависимой.

Медицина — это не только наука. Это искусство и в какой-то степени даже религия. Даже сейчас в современной медицине около 80% лечебных методик применяется на основе опыта, традиций и даже привычек, а не на основании исключительных научных исследований. Например, антибиотики, преднизолон, вакцинация, лучевая терапия, химиотерапия, разные хирургические вмешательства, переливание крови...

Наука или искусство?

Доктору Ба пока нравится в Беларуси. Он считает, что местная медицина и фармацевтическая промышленность не так зациклены на прибыли, как в других странах.

— В некоторых странах ученые проводят исследования, а потом приходит человек, который решает, какое лекарство надо выпускать, а какое нет — ему важно прежде всего получить прибыль, — *объясняет доктор.* — В Беларуси такого нет. Здесь думают и заботятся о больных. Я знаю о ваших проблемах — в больницах, в экономике. И именно поэтому стремлюсь еще больше здесь сделать. Есть такая поговорка: следовать за добротой. В Беларуси живут добрые люди, и я хочу им помочь...

Марина КОКТЫШ.

Из личного дела

Доктор Ва Х. Hoang — автор нескольких русских и международных патентов в лабораторной диагностике и лечении аутоиммунных заболеваний. Они уникальны тем, что сочетают в себе мировые научные разработки и традиции восточной медицины.

Доктор Ба — один из ведущих мировых экспертов в области альтернативной терапии для борьбы с астмой, аллергией, иммунодефицитом, аутоимунными заболеваниями, а также вирусными инфекциями.

В интернете есть много статей про доктора Ва Х. Hoang. Большинство — на английском, некоторые — на русском.

"При приеме данных лекарственных средств не наступает непосредственно устранение опухоли, однако они содействуют стабилизации клеточных мембран, исключая при этом вероятность раздражения; при этом также происходит регулирование уровня метаболизма и синтез клеточной энергии; вероятность оксидации свободных радикалов и клеточная метаплазия исключаются, — рассказывала о методике лечения раковых больных, которую использует доктор Ба, одно из зарубежных изданий. — Прохождение курса гарантирует увеличение продолжительности жизни и улучшение ее качества. Данные рентгенографии и томографии, а также результаты испытаний указывают на то, что по окончании лечения большинству пациентов удалось полностью избавиться от опухолей, при этом у большинства из них наблюдались либо кальцификация, либо шрамы".

НАРОДНЫ ФРОНТ: У ПАДЗЕЯХ І АСОБАХ

Быў цёплы кастрычніцкі дзень...

19 кастрычніка 1988 г. у цёплы сонечны дзень бабінага лета пасля работы я ішоў каля Дома кіно (цяпер Касцёл Святых Сымона і Алены) на вакзал, каб купіць білет і паехаць у чарговую камандзіроўку. У 1988 годзе маё жыццё ішло да лепшага хуткімі тэмпамі. У 1981 годзе я абараніў кандыдацкую дысертацыю ў прэстыжным дактарскім савеце па архітэктурнай археалогіі, выйшла мая першая манаграфія, якую прыхільна сустрэлі ў Маскве, Ленінградзе, Рызе, Кіеве і Вільнюсе. У 1988 годзе зацвердзілі тэму доктарскай дысертацыі. З 1976 года я працаваў у сістэме беларускай археалогіі: кіраваў аддзелам комплексных гістарычных даследаванняў, праводзіў раскопкі ў Лідскім, Крэўскім і Мірскім замках, вывучаў архітэктуру Мінска, Гродна, Мсціслава і іншых беларускіх гарадоў. У 1983 годзе пасля доўгай чаргі і чакання на прыватнай кватэры атрымаў у Серабранцы ўласную двухпакаёўку, паставіў на ногі ўлюбёную дачушку Надзейку, якая раней моцна хварэла.

У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гадоў далучыўся да руху чарговага Адраджэння, з 1982 года канчаткова на рабоце і ў сям'і перайшоў на беларускую мову. З 1978 года быў у КПСС, у 1988 годзе стаў сакратаром партыйнай арганізацыі беларускіх рэстаўратараў, арганізацыі, якая першая ў Мінску перавяла партыйную дакументацыю на беларускую мову (аб гэтым напісала партыйная газета "Звязда").

Я актыўна падтрымаў перабудову, выпісваў і чытаў усе саюзныя дэмакратычныя газеты і часопісы, найперш "Московские новости" і "Огонек".

І вось іду я па білет на вакзал, каб ехаць у чарговую камандзіроўку, і раптам каля Чырвонага касцёла сустракаю на вуліцы свайго старэйшага сябра і земляка, на той час прафесара Гродзенскага ўніверсітэта **Міхася Ткачова.** Павіталіся, пачалі гаворку. Міхась спытаў, куды я іду. Я адказаў. Тут Ткачоў і кажа:

— Слухай, Алег! Білет купіш заўтра, а зараз хадзем са мною на вельмі важнае і цікавае мерапрыемства ў Дом кіно. Пра ўсё даведаешся ў зале і, павер мне, ніколі аб гэтым не пашкадуеш!

Пайшлі мы. Зайшлі ў залу на другім паверсе. Шмат народу, ледзь знайшлі два вольныя месцы побач. Селі. Я звярнуў увагу на маладых хлопцаў-дружыннікаў з бел-чырвона-белымі павязкамі на рукавах. Такое я бачыў упершыню. На пасяджэнні спачатку стварылі "Мартыралог Беларусі" на чале з **Зянонам Пазьняком**, а потым нечакана для значнай колькасці прысутных (таксама і для мяне) сталі выбіраць Аргкамітэт па стварэнні Беларускага Народнага Фронту. Пачалі вылучаць кандыдатуры, але некаторыя вельмі паважаныя людзі ветліва адмовіліся. Потым абралі ў Аргкамітэт Міхася Ткачова, які пра стварэнне БНФ ведаў загадзя і спецыяльна ў гэты дзень прыехаў у Мінск з Гродна. І раптам, пасля адмовы чарговай асобы, прапанавалі маю кандыдатуру. Я крыху разгубіўся, паглядзеў на майго сябра Міхася і — нечакана для сябе — згадзіўся.

Але ведаў, які цяжар і адказнасць на сябе трэба ўзяць, будучы ў адной камандзе з **Васілём Быкавым, Рыгорам Барадуліным і Нілам Гілевічам.** Таксама разумеў, што маё жыццё пойдзе зусім у іншы бок і невядома, чым усё для мяне скончыцца. Так і здарылася.

Пасля сходу сябры Аргкамітэта засталіся і дамовіліся неўзабаве сустрэцца, каб абраць старшыню.

У наступны панядзелак, як заўжды, прыйшоў я ў Савецкі райкам КПБ на чарговую планёрку, якую ладзіла традыцыйна кіраўніцтва райкама з усімі сакратарамі партыйных арганізацый раёна.

Поўная зала прысутных. На трыбуне сакратар райкама, які паведамляе, што ў Мінску 19 кастрычніка варожымі сіламі створаны аргкамітэт БНФ, што КПБ не дапусціць, каб гэтая дэструктыўная арганізацыя існавала на Беларусі. Зачытаў спіс сяброў аргкамітэта БНФ, асабліва дасталося Васілю Быкаву, які пайшоў "не туды". Пасля партыйны сакратар паведаміў, што з Савецкага раёна Мінска ў аргкамітэт увайшоў толькі адзін чалавек, нейкі Трусаў, але партыя неўзабаве з ім разбярэцца. Гэта мяне вельмі абурыла, я падняў руку, папрасіў слова, выйшаў да трыбуны і сказаў, што Трусаў — гэта я, і папрасіў даць крыху часу, каб патлумачыць сваю пазіцыю. У зале пачаўся шум і вэрхал, але выказацца мне далі. Я коратка распавёў пра мэты і задачы БНФ, сказаў, што большасць з 35 сяброў аргкамітэта — камуністы, якія і з'яўляюцца "лепшымі сіламі КПСС", што разам з Гарбачовым выступаюць за перабудову; але на Беларусі ёсць шмат людзей, якія палітыкі Гарбачова не падзяляюць і ўсяляк яму перашкаджаюць. Слухачы ў зале падзяліліся прыкладна на тры групы: першыя выступілі супраць мяне, другія падтрымалі, а астатнія проста разгубіліся, і планёрка на гэтым скончылася. Да мяне падышлі некалькі знаёмых, найперш сакратары партарганізацый з ВНУ і абяцалі падтрымку. Дарэчы, адзін з іх потым, у 1990 годзе, быў старшынёй выбарчай акругі, дзе я абіраўся ў народныя дэпутаты ВС БССР і вельмі сумленна, з дакладнасцю да аднаго, палічыў галасы выбаршчыкаў. Я перамог у другім туры і набраў 50,1% галасоў, толькі на 157 галасоў болей, чым было неабходна для перамогі.

Адразу пачаўся розны ціск на сяброў аргкамітэта, камуністаў абяцалі выключыць з партыі, беспартыйных палохалі па-іншаму, але ніхто з 35 абраных чалавек афіцыйна не заявіў аб сваім выхадзе. Толькі некалькі чалавек пасля першых пасяджэнняў Аргкамітэта перасталі на іх хадзіць, але аб сваім выхадзе з аргкамітэта не абвяшчалі.

На першым пасяджэнні аргкамітэта, якое адбылося ў Доме літаратара (Фрунзе, 5), з ініцыятывы Васіля Быкава старшынёй абралі пісьменніка, сябра КПСС Васіля Якавенку, але пазней яго замянілі на Зянона Пазьняка, які пасля 30 кастрычніка 1988 года, пасля паходу ў Курапаты, стаў на доўгі час лідарам не толькі БНФ, але і ўсёй тагачаснай апазіцыі Беларусі.

Працаваць было цяжка. Пасля першых пасяджэнняў у Доме літаратара пускаць туды нас перасталі, і збіраліся мы ў розных месцах, паўлегальна. Дапамог нам мой сябра вядомы архітэктар **Сяргей Багласаў:** дазволіў збірацца ў яго майстэрні, у драўляным доме на вуліцы Кузьмы Чорнага, непадалёк ад Акадэміі навук. Збіраліся мы вечарамі, на вокнах майстэрні былі глухія чорныя фіранкі, і з вуліцы ніхто нас не бачыў.

Асноўная частка сяброў Аргкамітэта была з Мінска, і таму кворум на ўсіх пасяджэннях быў. Даволі часта прыязджаў з Гродна і Міхась Ткачоў.

Дзякуючы партыйнай прапагандзе і адпаведным артыкулам у прэсе, асабліва пасля скандальнай публікацыі ў газеце "Вечерний Минск" опуса "Пена на волне перестройки", пра нас хутка даведаліся людзі і пачалі масава ствараць на рабоце і па месцы жыхарства суполкі па падтрымцы БНФ. Кожны сябра Аргкамітэта меў свой раён. Мне (па месцы жыхарства) даручылі курыраваць Ленінскі раён. Першымі актывістамі тут сталі **Станіслаў Гусак і Уладзімір Бордак,** якія потым доўга кіравалі раённай арганізацыяй БНФ. Людзі прыходзілі да мяне дахаты, вялі доўгія гутаркі, атрымлівалі ўлёткі і розныя абвесткі. Частка сяброў Аргкамітэта наладзіла друкаванне розных газетак і бюлетэняў: асабліва людзі любілі "Навіны БНФ".

За паўгода ў БНФ уступілі тысячы чалавек, асабліва ў Мінску і вялікіх гарадах. Сярод іх былі камуністы і беспартыйныя, людзі розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў, розных узростаў, ад ветэранаў вайны да студэнтаў і рабочай моладзі. Значная частка з іх размаўляла па-руску альбо на трасянцы, але людзі паспяхова ўспаміналі беларускую мову, а некаторыя, асабліва прыезджыя, авалодалі ёю за якую пару гадоў.

Аргкамітэт паспяхова закончыў сваю работу ўлетку наступнага, 1989, года, калі ў Вільнюсе адбыўся першы з'езд БНФ. На з'ездзе быў абраны Сойм, у які ўвайшла частка сяброў першага аргкамітэта. Тады БНФ узначалілі Зянон Пазьняк (старшыня), прафесары **Міхась Ткачоў і Юрый Хадыка** (намеснікі).

Цікава, што пра дзейнасць аргкамітэта няма пакуль што ніводнай грунтоўнай публікацыі, не апублікаваны пратаколы пасяджэнняў; гэтым не цікавяцца журналісты і прафесійныя гісторыкі. Відаць, камусьці вельмі хочацца бясконца сцвярджаць, што незалежнасць звалілася беларусам, "як манна нябесная", раптоўна і нечакана, ніхто за яе не змагаўся, і таму можна кола гісторыі павярнуць назад. Але 19 кастрычніка 1988 г. назаўжды застанецца ў беларускай гісторыі. Цікава, што менавіта ў 1988 годзе ў СССР, дзякуючы Гарбачову, змянілася палітыка ў адносінах да рэлігіі. Было дазволена святкаваць 1000-годдзе Хрышчэння Русі, будаваць новыя і вяртаць вернікам забраныя ў іх храмы.

У гісторыі не бывае выпадковасці. І, відаць, не проста так Аргкамітэт быў створаны ў храме, у будынку касцёла Св.Сымона і Алены, і менавіта там выйшаў з нябыту наш нацыянальны бел-чырвона-белы сцяг, сцяг адроджанага хрысціянства, колеры якога так шануе каталіцкая і асабліва праваслаўная царква.

І зараз, калі я заходжу ў аднаўлены храм на плошчы Незалежнасці і чую, як сотні вернікаў спяваюць наш духоўны гімн "Магутны Божа", разумею, што 25 гадоў змагання за лепшы лёс Беларусі не прайшлі марна.



Алег ТРУСАЎ, сябра Аргкамітэта па стварэнні Беларускага Народнага Фронту.

ВІНШУЕМ!

Віктар КУПРЭЙЧЫК: «Пацешылі на старасці...»

Як паведамляла наша газета, вядомы беларускі шахматыст, міжнародны грасмайстар Віктар КУПРЭЙЧЫК уключаны ў Залу славы Міжнароднай федэрацыі шахмат. "Народная Воля" павіншавала Віктара Давыдавіча...



— Шчыра кажучы, я абсалютна не ведаю, па якім прынцыпе трапляюць у гэтую Залу славы, — шчыра прызнаўся грасмайстар.

— Ніколі там не былі?

— Ніколі. Толькі ў інтэрнэце чытаў, што знаходзіцца яна, калі не памыляюся, у штаце Місуры.

— Даведаліся аб сваім уключэнні ў ганаровую Залу славы таксама праз інтэрнэт?

— Рашэнне прыняла на сваім кангрэсе Міжнародная шахматная федэрацыя, аб гэтым паведамілі СМІ. Там жа, дарэчы, Гары Каспараў і вылучыў сваю кандыдатуру на пасаду старшыні ФІДЭ.

— Якія ў яго, на ваш погляд, шанцы?

— Тут вельмі шмат пытанняў. Каспараў папулярны ў шахматных краінах, але Ілюмжынаў мае падтрымку ў Афрыцы і Азіі.

— Вернемся да прыемнай падзеі. Уключэнне ў Залу сусветнай славы — што гэта для вас?

— Ды нічога асаблівага. Пацешылі на старасці. Хоць, натуральна, прыемна, што я — адзіны беларус, хто патрапіў у такую Залу. Магчыма, і апошні.

— А грашовае ўзнагароджанне за гэта не прадугледжана?

— Пра грошы нічога не пісалі. Але, як толькі прышлюць нешта, "Народная Воля" пра гэта даведаецца першая.

Аляксандр НІКАНОРАЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ: «Павіншавалі толькі тыя, хто быў і застаецца сябрам»

Як раней паведамляла наша газета, галоўным трэнерам зборных каманд Расіі па веславанні на байдарках і каноэ стане выдатны беларускі спартсмен, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу другога склікання Уладзімір ПАРФЯНОВІЧ. Карэспандэнт "Народнай Волі" датэлефанаваўся Уладзіміру Уладзіміравічу ў Расію, і той адказаў на некалькі пытанняў.

— Прэзідыум Федэрацыі прагаласаваў за маю кандыдатуру, у лістападзе будзе ўзгадненне, — распавядае суразмоўца. — Хоць прынцыпова пытанне ўжо вырашана. Я выконваю абавязкі галоўнага трэнера, засталіся фармальнасці.

— Наколькі нечаканым для вас было гэтае прызначэнне?

— Дастаткова нечаканым, бо я сябе добра адчуваў і на пасадзе старшага трэнера зборнай Расіі па байдарцы. Тым больш што і вынік добры паказалі ў гэтым годзе — два залатыя медалі ў алімпійскай праграме.

— Галоўным трэнерам вам яшчэ ніколі не даводзілася працаваць?

— Ніколі, і я разумею, наколькі гэта высокая і адказная пасада. Ты ж, па сутнасці, у адказе за ўсе каманды. Але нічога — будзем працаваць. Тым больш што да кансультацый заўсёды запрашаюцца вядомыя вучоныя, якія



дапамагаюць у рабоце.

— Колькі медалёў павінна заваяваць расійская зборная на Алімпіядзе? Паставілі задачу?

— Так. 2 залатыя медалі, 2 сярэбраныя і 1 бронзавы. Але я лічу, што задача павінна быць больш высокая. У каманды большы патэнцыял, на яе выдаткоўваюцца такія сродкі, што недахопу ні ў чым няма. Праблем з фінансаваннем наогул не бачу. Інвентар, зборы ў любым месцы — усё гэта ёсць. Напрыклад, беларуская зборная такога дазволіць сабе не можа.

— Вашы калегі з Беларусі патэлефанавалі, павіншавалі?

— Ведаеце, павіншавалі толькі тыя, хто і ў складаны для мяне час застаўся сябрам. А астатнія — проста калегі.

— Сям'ю з сабой у Маскву не перавозіце?

— Не, бо пакуль дзеці вучацца ў Мінску. Паміж зборамі буду прыязджаць дадому. У гэтым плане нічога не мяняецца.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

НУ І НУ!

Крэдыт пад 730 працэнтаў гадавых? Калі ласка...

Ці варта гульня свеч і ці не выйдуць бокам лёгкія грошы, якія прапануюць некаторыя крэдыторы, спрабавала разабрацца "Народная Воля".

Нашчадкі бабулі-працэнтшчыцы

Асабліва шмат рэкламы экспрэс-крэдытаў у вагонах метро. Пакуль людзі едуць па сваіх справах, кожная трэцяя аб'ява абяцае грошы хутка ды з дастаўкай на дом. Прапануюць ад некалькіх сотняў тысяч да пары мільёнаў рублёў. Праўда, стаць пазычальнікам можа не кожны. Напрыклад, адно сталічнае таварыства з абмежаванай адказнасцю выдае пазыкі толькі грамадзянам нашай краіны, якія зарэгістраваліся ў Мінску ці Мінскім раёне. Зрэшты, дастаткова і часовай рэгістрацыі, напрыклад, у студэнцкім інтэрнаце. Нават месца работы і заробак не іграюць істотнай ролі, галоўнае — мець *"стаж больш за 3 месяцы на апошнім месцы працы"*. Яшчэ адзін немалаважны факт — экспрэс-крэдыты выдаюць толькі людзям ад 22 да 65 гадоў.

Грошы прапануюць на розныя тэрміны — ад некалькіх дзён да некалькіх месяцаў. У сталічнай фірме, куды датэлефанавалася "Народная Воля", атрымаць грошы можна толькі на 3 месяцы. Надумалі ўзяць, напрыклад, далёка не астранамічную суму 2,5 мільёна рублёў? Праз 90 дзён аддаць прыйдзецца **4.187.700 рублёў**! Ветлівая прадстаўніца фірмы па тэлефоне растлумачыла: штомесячныя выплаты складуць "усяго" **1.395.900 рублёў**. У голасе тэлефоннай суразмоўцы пачынаюць звінець ільдзінкі, калі ўзнікае пытанне пра штрафы з-за магчымай недаплаты ці затрымкі.

— *А вы што, не ўпэўнены ў тым, што зможаце плаціць? За невыкананне тэрмінаў па аплаце прадугледжаны штрафы ад 10 да 100 працэнтаў сумы,* — растлумачыла супрацоўніца call-цэнтра. — *Але лепш не пратэрміноўваць плацяжы. Справы вельмі хутка накіроўваюцца ў суд.*

Калі падлічыць усе выдаткі, то атрымліваецца, што крэдыт выдаюць пад **273,5** працэнта гадавых. Пры гэтым стаўка сталічнага ТАА "сціплая" — 0,75 працэнта за дзень. Іншыя падобныя фірмы прапануюць за дзень карыстання ад 2 да **730 працэнтаў гадавых**. Услых гэтыя лічбы прадстаўнікі фірм-крэдытораў стараюцца не вымаўляць, а многія кліенты проста лянуюцца правесці банальныя падлікі. Вось і купляюцца на грошы з "дастаўкай на дом".

«Дзякуй» трэба казаць дурням?

Хто і на што бярэ экспрэс-крэдыты? Супрацоўнікі фірм, што выдаюць грошы, на гэтыя пытанні не адказваюць. Калі верыць каментарыям на інтэрнэт-форумах, то ў асноўным цікавяцца міні-пазыкамі жанчыны.

— *Бяруць на невялікую бытавую тэхніку, часам на абутак ці "сур'ёзную" вопратку кшталту паліто ці зімовых пухавікоў*, — распавяла "Народнай Волі" эканаміст **Вольга Астрожка**. — *Да мяне часцяком звяртаюцца знаёмыя ці знаёмыя знаёмых, каб я патлумачыла ім, як жа гэта так атрымалася, што замест мільёна ім трэба аддаць фірме два з паловай. Тое, што думаць трэба было раней, у рэшце рэшт пагаджаюцца ўсе. Тым больш што ў асноўным бяруць пазыкі не таму, што рэальна трэба, а проста захацелася нешта набыць.*

Жаданне набыць нейкую рэч бывае настолькі моцным, што кліенты фірм-крэдытораў нават не заўважаюць, на якія ўмовы падпісваюцца.

— *Не хачу назваць усіх беларусаў дурнямі, але такія словы даводзіцца ўжываць у дачыненні да тых, хто карыстаецца міні-крэдытамі,* — выказаўся эксперт па эканоміцы, стратэгічным і інавацыйным менеджменце ГА "Дыскусійна-аналітычная супольнасць "Ліберальны клуб" **Антон Балточка**. — *На жаль, за апошнія гады беларусаў навучылі жыць па заходніх мерках — у доўг. Нават заробак у краіне, бывае, павышаецца не ад таго, колькі чалавек працуе, а проста таму, што ёсць такі ўказ. Гэта пацвярджаюць даследаванні: рост сярэдняй заработнай платы склаў 19%, а прадукцыйнасці працы — і да 3% не дацягвае.*

Фінансавая і юрыдычная неадукаванасць — толькі адзін бок праблемы. З іншым даводзіцца разбірацца не юрыстам ды эканамістам, а псіхолагам.

— *Звычайна насцярожана да крэдытаў ставяцца людзі з павышаным узроўнем трывожнасці,* — патлумачыла псіхолаг **Наталля Герцына**. — *Яны адкладваюць грошы, вельмі дбайна ставяцца да тэхнікі, мэблі, а перад тым, як набываць што-небудзь, два разы падумаюць.*

Адваротны бок — калі людзі падсвядома атачаюць сябе крэдытамі, намагаюцца дасягнуць дабрабыту мары з дапамогай вось такога "мастка" з грошай. У нас яшчэ з савецкіх часоў людзі прызвычаіліся, што быць абавязаным — норма. Доўг раней аддавалі радзіме, грамадству, сям'і, а цяпер — банку ці фірме.

Крэдытны карт-бланш

Некаторыя грамадзяне амаль упэўнены, што пазыкі пад агромністыя працэнты выдаюць толькі фірмы, якія балансуюць на мяжы з законам. Банкам яшчэ год таму забаранілі выдаваць насельніцтву грошы пад рабаўніцкія працэнты. Чаму ж прыватнікам можна? Аказваецца, пра іх пакуль проста не падумалі.

— *Колькасць фірм, што выдаюць экспрэс-крэдыты, будзе толькі павялічвацца,* — разважае Антон Балточка. — *Нашы суайчыннікі прызвычаіліся да таго, што ў іхніх кішэнях ёсць грошы. І пакуль юрыдычная ды фінансавая адукаванасць будзе заставацца на ранейшым узроўні, беларусы будуць купляцца на аб'явы аб "грашах у пазыку". Пасля, безумоўна, будуць скардзіцца, што іх падманулі...*

Сёння крэдыты выдаюць амаль на любыя патрэбы. Калега не так даўно прызналася, што ёй прапанавалі набыць у крэдыт звычайную жаночую сумку. Калі выдаюць, значыць, і на такую прапанову знаходзяцца спажыўцы.

— *Наколькі шмат людзей звяртаецца па экспрэс-крэдыты, усё ж такі сказаць цяжка — мы не маем статыстыкі*, — разважае вядомы эканаміст **Леанід Злотнікаў**. — *Нашы людзі не жылі ў рыначных умовах і не навучыліся суадносіць сённяшнія даброты з заўтрашнімі стратамі. Працуе не розум, а эмоцыі. У нас яшчэ занадта слабы рацыянальны пачатак. На Захадзе людзі больш аналізуюць, а ў нас жывуць па Дастаеўскаму. Як у рамане "Ігрок", жадаюць атрымаць шмат і адразу, інакш нецікава.*

Пазыкамі пад неверагодныя працэнты ўжо зацікавіўся Нацыянальны банк Беларусі. Чакаецца, што да наступнага года дзейнасць фірмаў-крэдытораў будзе абмежавана. Спадар Злотнікаў лічыць, што гэтая мера пойдзе толькі на карысць беларусам. Справа ў тым, што няўдалы вопыт крэдытавання можа адштурхнуць чалавека ад вывучэння сур'ёзных банкаўскіх прапаноў...

Марыя МАЛЕВІЧ.

ПО ПОВОДУ

Юбилей со слезами на глазах...

5 ноября 1973 года под звуки заводского оркестра в Минске был открыт Дворец физической культуры "Горизонт". Приближается юбилей...

Мне, как первому директору комплекса, символический ключ вручил генеральный директор объединения В.А.Калинкин.

Каждому подразделению выделили время в спортивном зале, приступили к тренировкам сборные команды завода по баскетболу и волейболу. На базе ДФК тренировалась женская баскетбольная команда "Горизонт", которая в то время выступала в I лиге чемпионата СССР (тренер С.Халипский), ДЮСШ по баскетболу (девушки). Впервые в республике были организованы воскресные занятия "Вместе с мамой, вместе с папой".

Пионерами в стране мы были в открытии групп аэробики и карате (клуб "Юный десантник"). В группы аэробики не могли записать даже всех заводчан, которые желали заниматься. Кстати, о стоимости абонемента: для работников завода — 2 рубля в месяц, для горожан — 4 рубля. Команды цехов и отделов тренировались в спортзалах бесплатно. Школьники также посещали бассейн бесплатно.

За годы моей работы (я проработал 22 года — до 1995-го) научились плавать более 20 тысяч человек. Воспитано 10 мастеров спорта, несколько человек были в составе юношеской сборной СССР.

Но самых больших успехов добилась женская баскетбольная команда "Горизонт". А всего за 20 лет комплекс посетило более 5 миллионов человек!..

С вводом новых площадей мы надеялись преумножить наши спортивные успехи. Но, увы! Наши надежды не оправдались.

В 1991 году администрация и профком завода приняли решение о создании коммерческой структуры на базе дворца. К руководству КСК пришли люди, далекие от спорта. Для того чтобы делать деньги на спортсооружениях, нужно было вводить платные услуги, а во Дворце 60% времени отдавали спортивным и цеховым командам.

Освободили от работы легендарного баскетбольного тренера Семена Халипского, вскоре был закрыт клуб "Юный десантник". Начали сокращать время тренировок цеховых и сборных команд завода, спортзал детского бассейна и вовсе был сдан в аренду центру по фитнесу. Все это завершилось закрытием известнейшего баскетбольного клуба "Горизонт".

В 2008 году со ссылкой на аварийное состояние (а в 1995 году дворец находился в отличном техническом состоянии) в течение нескольких недель был произведен демонтаж всего комплекса. Были уничтожены великолепные чеканные работы в бассейне, вестибюле, залах. Сотни килограммов цветного металла бесследно исчезли, также в неизвестном направлении пропали 1300 кв. метров деревянного покрытия спортзалов...

В одной из центральных государственных газет общественность была проинформирована о варварском уничтожении одного из лучших залов города, но никакой реакции не последовало ни от Министерства спорта, ни от городских властей, ни от Федерации баскетбола. И это произошло в то время, когда в городе катастрофически не хватало спортзалов и бассейнов.

...Я очень хорошо помню 50—60-е годы прошлого века. Тогда в Минске спортплощадки были в парке имени М.Горького, на стадионе ИФК (парк Челюскинцев) размещались кроме площадок баскетбола и волейбола корты для игры в большой теннис. Стадион ручных игр на "Динамо" собирал тысячи любителей баскетбола, волейбола. Здесь проводились чемпионаты БССР, трибуны во время соревнований были переполнены.

Большой популярностью пользовался стадион "Трудовые резервы" на проспекте Победителей. Он был доступен практически всем.

Спортивный комплекс около цирка имел не только историческую ценность. На этой базе тренировались олимпийские чемпионы Е.Белова, О.Караваев, А.Медведь, Т.Самусенко, А.Романьков и другие. И вот сегодня, несмотря на то что общественность была против сноса этого сооружения, его разрушили и на этом месте возвели архитектурного уродца — многоэтажную гостиницу.

Все это снесли. Вместо этого спортсооружений построили крайне мало. Спортивная база настолько бедна, что попасть в спортзалы большинству просто невозможно. И это печально...

Виктор КОЛЕННИКОВ.

ШАХМАТЫ

Тонкий замысел
И.Моравец



Белые: Крh8, Ла2 (2).
Черные: Крg1, пп. g7, h5 (3).
Выигрыш.

Позиция на диаграмме выглядит совсем простой. Тем не менее это этюд чешского проблемиста, в котором белые добиваются победы тонким путем. Найти его мы предлагаем нашим читателям. Свои ответы присылайте по адресу: **220030 Минск, ул.Энгельса, 34а, редакция газеты "Народная Воля", "Шахматы".**

Партия года

Лучшей партией, сыгранной в 2012 году, по версии журнала "64-Шахматное обозрение", стала партия между гроссмейстерами Андреем Волокитиным (Украина) и Шахриаром Мамедьяровым (Азербайджан), сыгранная на клубном чемпионате мира в израильском курортном городе Эйлате. Украинский шахматист провел поединок в блестящем комбинационном стиле и одержал эффектную победу. Вот как развивались события.

А.Волокитин — Ш.Мамедьяров
Сицилианская защита

1.е4 с5 2.Kf3 d6 3.d4 cd 4.K:d4 Kf6 5.Kc3 a6 6.Ce3 Kg4 7.Cc1 Kf6 Молчаливое предложение ничьей повторением ходов. Но белые предпочитают продолжить сражение. 8.Cg5 Kbd7 9.Фе2 е6 10.о-о-о Фс7 11.f4 b5 12.f5 b4?! Ведет к опасным осложнениям для черных. Надежнее 12...е5 13.fe bc 14.ed4 K:d7 15.Фс4 cb+ 16.Kpb1 Kc5 17.е5 Лb8 (Плохо 17...de 18.Kb5! ab 19.Фd5 f6 20.С:b5+ Kpe7 21.Ce3! Kb7 22.Cc4 Kd6 23.Cc5 с решающим преимуществом белых) 18.ed С:d6 19.Ле1+ Kpf8 20.Cd3 h6? После этого хода белые проводят блестящую атаку с жертвой слона. 21.Cd8!! Ф:d8 22.Лhf1!! Лb7 23.Cg6 f6 24.Фd5 Грозит 25.Ф:d6+. 24...Ле7 25.Kc6 Cb7 26.Ф:c5 С:c5 27.K:d8 Cd5 28.Лd1 Ce4 29.Kf7! Л:f7? Ведет к проигрышу, упорнее было 29...С:g6 30.Лfe1! Эффектное добивание. 30...С:c2+ (или 30...С:g6 31.Лd8+ с матом, 30...f5 31.Лd8+ Kpe7 32.Л:h8 Лf6 33.С:f5!) 31.Kp:c2 Kpg8 32.Лd8+ Лf8 33.Л:f8+ С:f8 34.g4!! Теперь черной ладье вступить в игру уже не придется. **Черные сдались.**

**Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск,
вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная:
тэл.
(017) 3286871.
Тэл./факс
рэкламнага
аддзела: (017)
3286904, 3286906
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info**

ISSN 2071-9647

9 772071 964000 13081

Падпісныя індэксы: 63222, 632222

**Заснавальнік
і галоўны рэдактар
Іосіф Паўлавіч
СЯРЭДЗІЧ**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 14.10.2013 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 26470 экз. Заказ №.4323